# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*

**9 клас**

**Варыянт 1**

### Заданне 1.

[дз’і́ва з’дз’іў дл’а чалав’э́ка: ј’он часо́вы]

*За кожнае правільна затранскрыбіраванае фанетычнае слова – 1 бал.*

*Заўвага:* Гукі могуць перадавацца на пісьме рознымі літарамі або спалучэннямі літар: гук ***й*** можа – ***й, j***; падоўжаныя зычныя – дзвюма літарамі або літарай з рыскай зверху ***[c̄]***; фрыкатыўны гук ***г*** – літарай ***г*** або лацінскай літарай ***ɣ***; афрыкаты ***дз, дз’, дж*** – спалучэннем ***д, з, ж*** і інш.

### Заданне 2.

| Слова | Магчымае тлумачэнне | Магчымыя адпаведнікі |
|---|---|---|
| **Сэлфі** | Аўтапартрэт, зроблены на смартфон ці фотаапарат, часта на выцягнутай руцэ, і прызначаны для публікацыі ў сацыяльных сетках | Самафота, самавыява, самаадлюстраванне і пад. |
| **Валанцёр** | Чалавек, які добраахвотна і бясплатна займаецца грамадска-карысным дзейнасцю, аказвае дапамогу | Дабрачынец, ахвярнік, добраахвотнік і пад. |
| **Стрыт-арт** | Від мастацтва, творы якога ствараюцца ў вулічным асяроддзі (на сценах будынкаў, агароджах, асфальце). Уключае графіці, трафарэты, муралы | Вуліцароспіс, сценапіс, фасадароспіс і пад. |

*За кожнае правільнае тлумачэнне значэння – 1 бал, за максімальна дакладны адпаведнік – 1 бал.*

### Заданне 3.

| | | |
|---|---|---|
| *агонь* | ‘дзейнічаць неасцярожна, не лічачыся з небяспекай’ | ***гуляць з агнём*** |
| *дарога* | ‘дастаецца з вялікай цяжкасцю; дарма, лёгка не возьмеш каго-,што-н.’ | ***на дарозе не валяецца*** |
| *доўг* | ‘адказваць, адплачваць каму-н. тым самым (адносінамі, учынкам і пад.)’ | ***не заставацца ў даўгу*** |
| *заяц* | ‘брацца адразу за дзве справы, дамагацца дзвюх розных мэт’ | ***гнацца за двума зайцамі*** |
| *кішэнь* | ‘прычыняць грашовую страту’ | ***біць па кішэні*** |
| *тон* | ‘паказваць прыклал у чым-н., станавіцца ўзорам для іншых; аказваць уплыў на ход падзей’ | ***задаваць тон*** |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 4.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| *варажба* | ***варажбіт*** | *Маладзечна* | ***маладзечанец*** |
| *водаправод* | ***водаправодчык*** | *цымбалы* | ***цымбаліст*** |
| *будоўля* | – | *свіння* | ***свінар*** |
| *ашукаць* | ***ашуканец*** | *кірунак* | – |
| *курыца* | – | *гістарычны* | – |

*За кожны правільны адказ – 1 бал. За лішняе слова адымаецца 0,5 бала.*

**Заданне 5.**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | ***Назоўнік з канчаткам -і:***<br>жалюзі, СМІ, крохкі, ападкі | ападкі |
| 2 | ***Прыметнік, які мае адзін суфікс:***<br>надзейны, выратавальны, няясны, непазнавальны | надзейны |
| 3 | ***Займеннік, які не мае формы назоўнага склону:***<br>мной, табе, сябе, некага | сябе |
| 4 | ***Лічэбнік, які мае два канчаткі:***<br>пяцідзясяты, дзевяноста, шэсцьсот, паўтары | шэсцьсот |
| 5 | ***Дзеяслоў, у якім канчатак 1-й асобы адзіночнага ліку складаецца з аднаго зычнага гука:***<br>любіць, спяваць, даваць, пад’есці | пад’есці (пад’е-м) |
| 6 | ***Дзеепрыслоўе, утворанае ад дзеяслова ІІ спражэння:***<br>бегучы, смеючыся, сказаўшы, вырасшы | смеючыся |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 6.**

| № сказа | Прыкладнае тлумачэнне памылкі (пры яе наяўнасці) | Прыкладны варыянт выпраўленага сказа |
|---|---|---|
| 1 | Памылка звязана з афармленнем аднародных членаў сказа. Злучнік ***не толькі…, але і*** звязвае аднародныя члены сказа. Значыць першая частка злучніка (***не толькі…***) павінна стаяць перад першым аднародным членам сказа, а другая частка (***але і…***) – перад другім | Асноўная мэта зборніка – дапамагчы ***не толькі*** настаўнікам беларускай мовы, ***але і*** вучням у падрыхтоўцы да выпускнога экзамену. |
| 2 | Памылка звязана з афармленнем дзеепрыметнікавага звароту. Дзеепрыметнікавы зварот не разрываецца | ***Уключаныя ў зборнік*** тэксты падабраны з улікам наяўнасці ў іх асноўных арфаграм і пунктаграм, вывучэнне якіх прадугледжана праграмай па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. |

| | | |
|---|---|---|
| **3** | Памылка звязана з афармленнем дадаанай азначальнай часткі ў складаназалежным сказе. Даданая азначальная частка ставіцца, як правіла, пасля назоўніка, да якога адносіцца | Творы Сымона Буднага, ***у якіх наш асветнік выступаў за вызваленне чалавечага духу, за свабодную стваральную працу***, мелі вялікую папулярнасць сярод жыхароў Беларусі. |
| **4** | Памылка звязана з ужываннем ступені параўнання прыметніка. Пры адсутнасці параўнання, а таксама ў тым выпадку, калі яно не падразумяваецца, трэба выкарыстоўваць найвышэйшую ступень параўнання прыметнікаў (простую або складаную форму) | Любчанскі замак славіўся сваёй ***найбагацейшай (самай багатай)*** бібліятэкай. |
| **5** | Няма памылак | – |
| **6** | Памылка звязана з каардынацыяй дзейніка і выказніка ў дадзенай частцы складаназалежнага сказа. Пры дзейніку, выражаным займеннікам ***хто***, выказнік ставіцца ў форме адзіночнага ліку | Удзячныя нашчадкі шануюць памяць пра тых, ***хто*** цаною свайго жыцця ***адстаяў*** Перамогу. |

*За кожны правільна запоўнены радок (у тым ліку за ўказанне на адсутнасць памылкі) – 1 бал (0,5 бала за выяўленне і 0,5 бала за тлумачэнне памылкі).*

**Заданне 7.**

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ:

Жыў сабе *(жыў; жыў-быў)* на свеце Зялёны Конь. Вочы ў яго былі як агрэст, грыва – як хмель, які аплятае платы і дрэвы, спіна была як мяккі мох, і яе кожны раз *(заўсёды)* хацелася пагладзіць. Панчошкі на нагах – серабрыстыя, як лісце *(лісты)* таполі *(топаля)*, а хвост быў падобны да ядлоўца *(на ядловец)*. Жыў Зялёны Конь на волі, у лясах і ў глушы, і пасвіўся дзе хацеў. Запрымеціць *(запрыкмеціць)* яго сярод зеляніны *(зелені)* было вельмі і вельмі цяжка, і людзі, якія хадзілі ў лес, ніколі яго не заўважалі.

*За кожную памылку перакладу (лексічную або граматычную) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,5 бала, за кожную памылку ў афармленні (арфаграфічную або пунктуацыйную) – 0,25 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

| | |
|---|---|
| **А** | Персанаж |
| **Б** | Перакрыжаваная рыфмоўка |
| **В** | Сюжэт |

| | |
|---|---|
| **Г** | Тропы |
| **Д** | Анафара |
| **Е** | Ямб / 3-стопны ямб / вершаваны памер |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 9.**

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **А** | 3 | **Б** | 4 | **В** | 2 | **Г** | 7 | **Д** | 5 | **Е** | 1 |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 10.**

*Ацэнка задання складаецца з трох кампанентаў: ацэнкі фактычных ведаў пра аўтара, назву твора і імя галоўнага героя, ацэнкі паўнаты апісання эпізоду, ацэнкі якасці прапанаваных парад.*

*Фактычныя веды пра аўтара, назву твора і імя галоўнага героя*

| Параметр | Адказ | Колькасць балаў |
|---|---|---|
| **Аўтар** | Змітрок Бядуля | 0,5 |
| **Назва твора** | “На Каляды к сыну” | 0,5 |
| **Імя сына** | Лаўрэнцій Кіпрыянавіч / Лаўрук / Лаўручок | 1 |

*Паўната апісання эпізоду*

| Крытэрый | Колькасць балаў |
|---|---|
| Фінальны эпізод апісаны дастаткова поўна, адсутнічаюць фактычныя памылкі, колькасць слоў – да 100 | 1 |
| Фінальны эпізод апісаны дастаткова поўна, ёсць 1-2 фактычныя памылкі і/або колькасць слоў больш за 100 | 0,5 |
| Фінальны эпізод апісаны няпоўна (адсутнічаюць ключавыя сцэны “непазнавання” сынам маці, адкупленне грашыма)<br>АБО<br>Маецца больш за 2 фактычныя памылкі<br>АБО<br>Адказ адсутнічае | 0 |

*Якасць прапанаваных парад:*

| Крытэрый | Колькасць балаў |
|---|---|
| Прапанаваны тры парады, якія адпавядаюць тэксту і ўмовам задання | 3 |
| Прапанаваны дзве парады, якія адпавядаюць тэксту і ўмовам задання<br>АБО<br>Прапанаваны тры парады, але выкананы толькі дзве ўмовы задання для парад | 2 |
| Прапанавана адна парада, якая адпавядае тэксту і ўмове задання<br>АБО<br>Прапанаваны тры ці дзве парады, але выкананы толькі адна ўмова задання для парад | 1 |
| Усе прапанаваныя парады не адпавядаюць тэксту ці ўмовам задання<br>АБО<br>Адказ адсутнічае | 0 |